КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСК

# Героі дня—праходчыкі

СТАРАННА працуюць у гэтыя дні праходчыкі шахтабудаўнічага ўпраўлення. Рыхтуючы дастойную сустрэчу Кастрычніку, яны ў верасні вялі праходку ствалоў у лік кастрычніка. З пачатку года падрыхтавалі 820 пагонных метраў падземнага тунеля, гэта на 50 метраў больш планавага задання.

Асаблівы поспех выпаў на долю брыгады Анатоля Селіванава — яна за 9 месяцаў прыглыбілася на 368 метраў, а звяно Івана Зайко з гэтага ж калектыву ідзе ў авангардзе праходчыкаў ствала № 1.

Слаўна папрацавалі ў верасні і праходчыкі Міхаіла Волкава. Яны замацавалі дадаткова да задання 10 пагонных метраў шахтавага ствала.

Паспяхова спраўляюцца з даручаным заданнем брыгада скразной праходкі, якой кіруе Дзмітрый Залатароў. Рабочыя ўдарнага звяна замацавалі на шахтавым ствале № 2 семдзесят пагонных метраў горных выпрацовак новым спосабам мацавання — пластабетонам.

Вялікую задачу паставілі перад сабой шахтабудаўнікі: да канца года здаць пад прамысловую распрацоўку два ствалы. Для гэтага патрэбна выканаць яшчэ 300 пагонных метраў праходкі. Такое заданне шахтабудаўнікам па плячу.

А. ВАСІЛЬЕУ.